Алена ВЕЛЯНЦЭВІЧ

## ПРА ЗВЯРОЎ ДЛЯ САМЫХ МАЛЕНЬКІХ

Шмат жывёл жыве на свеце —
І маленькіх, і вялікіх,
Ведаць іх павінны дзеці,
Шанаваць іх і любіць іх.

Хтось жыве ў заапарку,
Хтось у лесе ці ў двары.
Хтось карысны ў гаспадарцы —
Пазнаёмімся, сябры!

### Пеўнік

З першым праблiскам зары
Чуваць песню ў двары.
Гэта пеўнік наш стракаты
Будзіць, кліча выйсці з хаты.

### Кот

Кот не любіць быць у брудзе:
Вымывае лапы, грудзі,
І з акна, дзе павышэй,
Пільна сочыць ён мышэй.

### Парася

Закруціўшы хвост спружынкай,
Па двары гуляе свінка
І лычом, нібы рыдлёўкай,
Робіць ямкі, сыпле горкі.

### Сабака

У сабакі да відна
Праца сёлета адна —
Несці вахту каля хаты,
Не даваць чужынцам лапы.

### Індык

Чуеш гучнае “кулдык”?
Сцеражыся, там індык!
Любіць ён на ўсіх злавацца,
Лепш табе яго цурацца.





# Загадкі

Ходзіць ранкам па расе,
Грываю сваёй трасе.
Ен пацягне плуг і воз,
Любіць сена і авёс.





Ходзіць важна па двары,
Ён надзейны вартавы.
Спіць ці ў будцы, ці на ганку,
Любіць косткі грызці зранку.

Днём на пашы, на траве,
Ноччу — у сваім хляве.
Штосьці нам ўсім дае —
Моцны той, хто яго п’е.



*Малюнак Анастасіі Смародзіны*